# 1917 - 1976



# НЯХАЙ ЖЫВЕ ВЯЛІКІ КАСТРЫЧНІК!

ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 30 (1142) ● 4 лістапада 1976 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.

Уся наша вялікая краіна—ад Брэсцкай крэпасці-героя да Камчацкіх сопак, ад Карэльскіх азёраў да гарачай Кушкі ў ззянні чырвоных сцягоў. Па зямлі савецкай ідзе перамаганосны Кастрычнік. Працоўныя Краіны Саветаў, першай у свеце сацыялістычнай дзяржавы, усё прагрэсіўнае чалавецтва адзначаюць 59-ю гадавіну Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, рэвалюцыі, якая паклала пачатак новаму ладу, дзе працоўны чалавек — гаспадар свайго лёсу.

Вось ужо больш за паўвека нас вядзе ад перамогі да перамогі ленінская Камуністычная партыя.

Гісторыяй нам наканавана быць першымі ва ўсім, быць першаадкрывальнікамі ў добрых справах, у жыцці чалавецтва. І мы, савецкія людзі, народы сацыялістычнай садружнасці, якою б цяжкай ні была наша дарога ў заўтра, да светлай, яшчэ больш шчаснай мэты чалавецтва — камунізму, кірунку не зменім.

Наша сіла і наша перакананасць за пяцьдзесят дзевяць гадоў узмужнелі і загартаваліся маладосцю дзейсных спраў, захапленнем веліччу грандыёзных планаў, што вызначае партыя, кіруючая і натхняючая сіла савецкага грамадства.

Кастрычніцкае свята — гэта перш за ўсё свята маладосці дваццатага веку, свята маладосці велічных спраў, якія думкамі вялікага Леніна вызначаны і яго партыяй — вялікай партыяй камуністаў Савецкай дзяржавы — паспяхова ажыццяўляюцца.

## КЛОПАТЫ АБ ВЫХАВАННІ СТУДЭНЦТВА— НА ПЕРШЫ ПЛАН

**АДБЫЛАСЯ XXXI СПРАВАЗДАЧНА - ВЫБАРНАЯ ПРАФСАЮЗНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА. СА СПРАВАЗДАЧНЫМ ДАКЛАДАМ АБ РАБОЦЕ ПРАФКОМА БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА ВЫСТУПІЎ СТАРШЫНЯ ПРАФКОМА А. М. ЖЫЛІНСКІ.**

**Ніжэй публікуюцца матэрыялы канферэнцыі.**

Прафсаюзная арганізацыя універсітэта складае на сённяшні дзень 10 тысяч 30 членаў прафсаюза і аб'ядноўвае 11 факультэцкіх прафсаюзных арганізацый і 378 прафсаюзных груп. У справаздачны перыяд прафком акцэнтаваў сваю ўвагу на рашэнні галоўных задач, пастаўленых XXV з'ездам КПСС і XXVIII з'ездам КПБ перад вышэйшай школай, па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў.

На першым сваім пленарным пасяджэнні прафком выбраў са свайго саставу рабочы орган — прэзідыум у колькасці 11 чалавек. Пасяджэнні прафкома праводзіліся не менш аднаго разу ў месяц, а пасяджэнні прэзідыума прафкома — па меры неабходнасці, але не радзей двух разоў у месяц. Актывізацыя дзейнасці прафбюро факультэтаў вызваліла прафком ад неабходнасці разглядаць многія прыватныя пытанні, дазволіла сканцэнтравацца на найбольш важных справах. На пленарных пасяджэннях прафкома ў парадку кантролю заслухоўваліся справаздачы старшынь прафбюро факультэтаў аб выкананні раней прынятых пастаноў, аб прапагандзе сваіх факультэтаў сярод працоўнай і сельскай моладзі, аб рабоце са студэнтамі, якія жывуць на прыватных кватэрах, і г. д. На пасяджэннях прэзідыума заслухоўваліся справаздачы пастаянных камісій па пытаннях павышэння паспяховасці і дысцыпліны, падрыхтоўкі і правядзення мерапрыемстваў і аглядаў-конкурсаў, па паляпшэнню жыллёва-бытавых умоў студэнтаў, арганізацыі грамадскага харчавання.

**Арганізацыйна - масавая камісія прафкома вялікую ўвагу перш за ўсё ўдзяляла вучобе прафактыву. Практыка паказала, што больш эфектыўна праводзіліся заняткі з прафактывам па факультэтах, дзе перад імі выступалі члены прафкома, якія маюць вопыт прафсаюзнай работы.**

**Арганізоўваліся нарады па абмену вопытам работы старшынь і членаў студэнцкіх саветаў. У практыку ўвайшло правядзенне расшыраных пасяджэнняў прафкома з запрашэннем на іх прафсаюзнага актыву. Прафкамітэт стварыў пастаянна дзеючую школу актыву, якая здзяйсняла цэнтралізаванае кіраўніцтва вучобай актыву.**

(Працяг на 2-й стар.)

## АГЛЯД КАМСАМОЛЬСКІХ РАДОЎ




**Партыя цвёрда верыць, што моладзь, камсамольцы ўпішуць новыя слаўныя старонкі ў летапіс камуністычнага будаўніцтва!**
**Л. І. БРЭЖНЕЎ.**

Ва універсітэце закончыўся абмен камсамольскіх дакументаў. Ён стаў тым рычагом, з дапамогай якога на новы ўзровень, на больш высокую ступень узнята ідэалагічная работа.

З 1 красавіка 1975 года па 30 кастрычніка 1976 года новыя білеты атрымалі 10 тысяч 500 камсамольцаў універсітэта. Паспяховае правядзенне абмену на мехмаце, радыёфізічным факультэце, у НДІ ПФП паказала палітычную сталасць працуючых тут камсамольскіх работнікаў, высокі ўзровень арганізатарскіх здольнасцей камсамольскіх кадраў і актыву.

(Заканчэнне на 3-й стар.).





# АГЛЯД КАМСАМОЛЬСКІХ РАДОЎ



Да дня нараджэння камсамола білеты новага ўзору атрымалі студэнты радыёфізічнага факультэта. У гэты дзень да камсамольцаў прыйшлі ветэраны вайны і працы.

— Ваш няспынны клопат, — сказаў Герой Сацыялістычнай Працы акадэмік АН БССР Антон Нікіфаравіч Сеўчанка, — свята берагчы і выконваць запаветы Ільіча ва ўсіх галінах ведаў.

Студэнты атрымалі білеты з рук камсамольца 30-х гадоў, ветэрана Вялікай Айчыннай вайны Аляксея Еўдакімавіча Семакова.





(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.). Фотарэпартаж Г. Марозава.

# МЕРАЙ ТВОРЧАСЦІ

Нядаўна ў Віцебску закончыў сваю работу VI Рэспубліканскі навукова-метадычны семінар па навукова-даследчай рабоце студэнтаў. На працягу двух дзён ішла сур'ёзная размова па пытаннях канцэнтрацыі творчага патэнцыялу студэнтаў па распрацоўцы навуковых праблем і выкананню канкрэтных заказаў вытворчасці. Абмяркоўвалася задача дасягнення такога становішча, каб кожны студэнт за гады вучобы ў вышэйшай навучальнай установе авалодаў метадамі арганізацыі навуковых даследаванняў, умеў самастойна выкарыстоўваць свае веды на практыцы.

Выступаючыя падкрэслівалі, што вышэйшая школа заўсёды імкнецца прыцягнуць студэнтаў да ўдзелу ў навуковых даследаваннях. Але ў сувязі з гэтым узнікаюць цяжкасці з часам. Патрэбна адрываць ад вучэбных заняткаў дарагія гадзіны, каб займацца творчым пошукам. Таму ўзнікла надзённае пытанне — уключэнне даследчых работ у вучэбныя планы. У рабоце семінара разам з вучонымі, навуковымі работнікамі НДРС прынялі ўдзел камсамольскія актывісты ВНУ, загадчыкі аддзелаў студэнцкай моладзі абкомаў камсамола.

Семінар паказаў, што ў рэспубліцы шмат ужо зроблена і робіцца для развіцця навукова-даследчай работы студэнцтва. Разнастайнымі формамі навуковай творчасці ахоплена 78 тысяч студэнтаў рэспублікі, або 84,9 працэнта. Толькі за 1975 год рэкамендавана да ўкаранення ў вытворчасць 2170 дыпломных работ. За той жа год студэнцтвам выканан па гаспадарчых дагаворах аб'ём работ на суму 1 мільён 90 тысяч рублёў.

Усё большы размах набывае рацыяналізатарская і вынаходніцкая дзейнасць студэнтаў. За апошнія пяць гадоў 171 работа адзначана аўтарскімі пасведчаннямі.

У сучасны момант колькасць студэнцкіх даследаванняў значна павялічылася. Зараз ставіцца задача прыцягнуць кожнага студэнта да навуковай дзейнасці. Найбольш важнае значэнне навукова-даследчай работы студэнта заключаецца ў тым, што яна вучыць самастойна працаваць. Менавіта праз прызму творчасці магчыма выхаванне гарманічна развітай асобы.

**В. АРЭШКАВЕЦ,**
**удзельнік семінара.**

# ЦІКАВЫ КАБІНЕТ

У галоўным корпусе універсітэта працуе кабінет сацыяльна-эканамічных і гістарычных навук. Наведаў я яго ў той час, калі ён быў ужо запоўнен студэнтамі. Рабяты сядзелі за сталамі, паглыбіўшыся ў кнігі. Старэйшы бібліятэкар Нэла Мацвееўна Славінская гаворыць:

— Наш кабінет працуе ўжо больш года. У ім знаходзіцца 56 пасадачных месц. Займацца прыходзяць студэнты ўсіх факультэтаў. За дзень кабінет наведваюць па 150—180 чалавек, а ў асобныя дні нават да 200. У нас свабодны доступ да кніг, можна выбраць патрэбную літаратуру. Выбар кніг вялікі: матэрыялы з'ездаў, энцыклапедыі, даведачныя выданні, творы К. Маркса і У. І. Леніна, літаратура па марксісцка-ленінскай філасофіі, гісторыі КПСС, палітэканоміі, логіцы і інш.

У кабінеце знаходзяцца цікава аформленыя стэнды. Студэнты любяць свой кабінет.

**В. ЧАРНУШЭНКА,**
**студэнт І курса журфака.**

## Весткі з факультэтаў

# ФПМ

**Добра папрацавалі «прыкладнікі» ў час сельгасработ. Узнагарода—шматлікія граматы гаспадарак. А зусім нядаўна пяцікурснікі працавалі на ўборцы бульбы ў Уздзенскім раёне Мінскай вобласці.**

**Цяпер яны зноў узяліся за падручнікі.**

***

**26 кастрычніка агітбрыгада СБА «Сучаснік-76» факультэта прыкладной матэматыкі выступіла з канцэртнай праграмай на справаздачна-выбарнай канферэнцыі ў ТВ-76. Навучэнцы прынялі сваіх шэфаў вельмі гасцінна. Канцэрт прайшоў паспяхова і прынёс гледачам вялікае задавальненне.**

***

**30 кастрычніка тая ж агітбрыгада выступіла ў сярэдняй школе № 43 г. Мінска. Вучні гэтай школы і студэнты ФПМ маюць даўнюю сувязь. Студэнты неаднаразова выступалі з праграмамі мастацкай самадзейнасці, лекцыямі, гутаркамі.**

**В. ПЛАТНІЦКІ.**

## У некалькі радкоў

# ДЗЕНЬ ДОНАРА

Імкненне заўсёды быць неабходным людзям, жаданне прыносіць ім радасць, гатоўнасць у любую хвіліну прыйсці на дапамогу — характэрныя рысы савецкага чалавека.

Гэта яшчэ раз пацвердзілася пры правядзенні ва універсітэце з 27 па 29 кастрычніка дня донара. Сваю кроў пажадалі аддаць 558 студэнтаў і супрацоўнікаў БДУ. Найбольш актыўнымі донарамі былі студэнты юрыдычнага факультэта: 95 чалавек бескарысліва аддалі сваю кроў.

**А. ЛАПЦЁНАК.**

# ДАЙСЦІ ДА КОЖНАГА

**Факультэт журналістыкі нешматлікі. На камсамольскім уліку тут знаходзіцца 371 студэнт. Між тым грамадска-палітычная актыўнасць журналістаў ва ўнутрыуніверсітэцкім жыцці відавочная. Нездарма журфак называюць кузняй ідэалагічных кадраў. Па паспяховасці студэнтаў ён займае трэцяе месца сярод факультэтаў БДУ.**

**У мінулы чацвер на журфаку адбыўся справаздачна-выбарны камсамольскі сход, на якім былі падведзены вынікі работы арганізацыі за навучальны год, вызначаны асноўныя напрамкі дзейнасці на будучае.**

Наша галоўная задача, адзначыў у сваёй справаздачы сакратар камітэта камсамола факультэта Усевалад Грыняк, — гэта выдатная вучоба, высокая грамадская і творчая актыўнасць. Арганізацыі было аказана вялікае давер'е — адной з першых у БДУ пачаць абмен камсамольскіх дакументаў. Характарызуючы правядзенне абмену, падводзячы вынікі іншых ударных спраў студэнтаў-журналістаў, У. Грыняк не раз звяртаўся да слоў «арганізавана», «на высокім узроўні», «па-дзелавому». За выдатную вучобу, грамадскую актыўнасць два студэнты факультэта — С. Новікаў і А. Уліцёнак — узнагароджаны знакам ЦК ВЛКСМ і Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР «За выдатную вучобу». Вялікая грамадска-палітычная работа пры добрасумленнай працы на палетках была праведзена студэнтамі ў час «бульбяной кампаніі».

Прыемных слоў было сказана на сходзе нямала. Але У. Грыняк у справаздачы ўскрыў і недахопы ў дзейнасці арганізацыі. Парадаксальная сітуацыя — побач з актыўнасцю можа працвітаць інертнасць, неарганізаванасць. Сустрэча з цікавым чалавекам — а ў аўдыторыі пуста. Чаму? У інтэрнаце жывуць амаль усе камсамольскія актывісты. Жывуць часам сумна. На сходзе ішла сур'ёзная размова пра аўтарытэт камсамольскіх важакоў. «Камітэтчыкі» павінны ствараць атмасферу нецярпімасці да «хвасцістаў» не толькі ў камітэце, але і ў той групе, дзе вучацца.

Надзённы «хлеб» студэнтаў-журналістаў — друк, асабліва насценны. Між тым у апошні час насценгазета «Журналіст» значна знізіла сваю якасць. Тут друкуюцца выпадковыя матэрыялы, газета робіцца намаганнямі вузкага кола студэнтаў. Пра гэта гаварыў у сваім выступленні студэнт Г. Марозаў. Сход намеціў дзейсную праграму павышэння якасці насценгазеты.

«Камсамольскі пражэктар» — таксама газета. У руках журналістаў яна ператвараецца ў эфектыўны сродак барацьбы з прагульшчыкамі і «хвасцістамі». Дастаткова ўспомніць апошні нумар «КП». А ўсяго за год выпушчана 27 нумароў, 14 «маланак», праведзена 12 рэйдаў. Але выступленні «Пражэктара», на жаль, мала абмяркоўваюцца на камсамольскіх сходах груп, і таму, адзначалася на сходзе, трэба павысіць выніковасць рэйдаў і праверак.

Шмат надзённых пытанняў узняў у сваёй прамове студэнт А. Прастата, адказны за культмасавы сектар. Ён выказаў заўвагу камітэту камсамола універсітэта, які ў недастатковай ступені цікавіцца станам культурна - масавай работы на журфаку.

І У. Грыняк, і студэнты Т. Нічыпарук, А. Каменка, Н. Валасюк гаварылі пра неабходнасць сістэматычнай, глыбокай, эфектыўнай вучобы камсамольскага актыву. Не аўтарытэтны той камсорг, які не ведае нават, як запаўняць дакументацыю.

На сходзе выступіў намеснік сакратара камітэта камсамола БДУ В. Русак. Каму, як не журналістам, адзначыў ён, узняць лозунг: «Ні аднаго пасіўнага побач!». Дайсці да кожнага — важнейшая задача новага саставу камітэта камсамола факультэта.

Дэкан журфака, прафесар Р. Булацкі, адзначыўшы пэўныя недахопы, даў станоўчую ацэнку працы камітэта. Рыгор Васільевіч нацэліў камсамольцаў на далейшую напружаную работу ў святле рашэнняў XXV з'езда КПСС, важнейшых пастаноў партыі і ўрада.

**На сходзе не было абыякавых. У абмеркаванні даклада прынялі актыўны ўдзел камсоргі, радавыя камсамольцы. Па традыцыі на сходзе прысутнічалі выкладчыкі і супрацоўнікі журфака, якія заўсёды цікавіліся і цікавяцца справамі камсамольцаў.**

**Справы гэтыя — немалыя. Камітэт камсамола універсітэта даручыў журналістам асвятленне жыцця камсамольскай арганізацыі нашай установы. І яшчэ адна ўдарная справа — вядзенне ваенна-патрыятычнай работы.**



**Камсамольцы далі абяцанне сустрэць юбілей Савецкай улады толькі з добрымі і выдатнымі паказчыкамі ў вучобе, высокай творчай і грамадскай актыўнасцю.**

**С. УСЦІНОВІЧ.** Фота А. Басава і А. Казака.



# Ружовы ранак

літаратурная старонка



## У ПАДАРУНАК — ПЕСНІ І ТАНЦЫ

Здаецца, зусім нядаўна, як вялікае свята дружбы і братэрства двух народаў, адзначалі мы Дні польскай літаратуры ў Беларусі. Сёння зноў у БДУ гучыць польская мова. Ў госці да студэнтаў універсітэта прыехаў фальклорна-этнаграфічны ансамбль песні і танца Ягелонскага універсітэта г. Кракава «Славянкі». Свае канцэрты польскія артысты прысвяцілі 59-годдзю Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

...Узляцелі ў танцы пары. Дзявочыя абцасікі выбіваюць мелодыю знаёмых нам «Кракавяка» і «Мазуркі», на тварах — натхненне. Мілагучныя польскія народныя песні «Чырвоныя ягады», «Мая матуля», «У Кадзідлянскім лесе» ўплятаюцца ў вянок сілезскіх танцаў, уражваюць майстэрствам выканання. З залы за канцэртам сочыць кіраўнік ансамбля Генрых Вольф-Здэніцкі. Як заўсёды, уважлівы кіраўнік дэлегацыі Збігнеў Бонк. Аркестрам кіруе адзін з ветэранаў музычнага калектыву Мар'ян Жадэк. Другі старэйшына ансамбля — саліст Яцэк Дутка.

Як сказаў пасля канцэрта Генрых Вольф-Здэніцкі, творчасць ансамбля прысвечана прапагандзе славянскіх песень. Мелодыі Босніі і Харватыі, Македоніі і Далматыі, Сербіі і Славеніі, Чэхіі і Славакіі, Расіі і Украіны і, канешне, Польшчы гучалі ў канцэртных залах многіх заходнееўрапейскіх дзяржаў. Ансамбль мае многа ўзнагарод. «Славянкі» выступаюць у нацыянальных касцюмах, падараваных студэнтам удзячнымі гледачамі СССР, Югаславіі, Балгарыі.

«Славянкам» — 17 год. Цяперашняя паездка — дваццаць шостае замежнае турнэ. Спевакоў і танцораў у паездцы суправаджаюць студэнты філалагічнага факультэта БДУ ў ролі перакладчыкаў.

— Нам вельмі спадабаўся Мінск, яго жыхары, — я гутару з членам кіраўніцтва ансамбля Іосіфам Мендралам. — Цікавым было знаёмства са студэнтамі універсітэта. Не забудзем мы і паездкі ў Хатынь, на Курган Славы. Але больш за ўсё нас уразіў музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны — гэты унікальны помнік народнаму подзвігу.

У нашым рэпертуары ёсць рускія песні «Калінка», «Стэп» і іншыя. Нядаўна мы запісалі некалькі беларускіх песень і танцаў. Іх прэм'ера адбудзецца ўжо ў Польшчы.

С. ШЫДЛОЎСКАЯ.



У музеі. Фота А. БАСАВА.

Тонкаю змейкаю ўецца конная дарога сярод зялёных палёў. Пуста навокал. Толькі высокі белабрысы хлопец крочыць па дарозе бадзёрай маладой хадой. Ідзе ў горад — тут не так і далёка, ды і прыемна прайсціся сам-насам, у цішыні.

Мара яго збылася, ён прынят у інстытут, куды і накіроўваецца. Пятрусь аглядваецца — велізарная ліпа ўзяла сваімі голлямі ў палон дах яго дома. Пятро памятае, як разам з іншымі хлапчукамі калаціў з маладых клейкіх ліпавых лісцяў майскіх жукоў. Іх потым падкідалі высока ўгару і ўслухоўваліся, «матор» чыйго жука гудзе больш зладжана і басавіта, калі той уключаў «узлёт».

Але па-сапраўднаму ясна і ярка запомнілася адно лета.

Да іх у вёску прыехала кінагрупа — здымалі фільм аб сяле. Увагу Пятра прыцягнула зусім яшчэ юная артыстка — год пятнаццаці-шаснаццаці. Яна настойліва вучылася ездзіць на кані — трэба было для кадра. Не раз хлопец быў сведкам яе падзенняў. Рэжысёр фільма хваляваўся і злаваў, хваляваліся ўсе акцёры, але, пэўна, найбольш сама няўдачніца.

Аднойчы, праходзячы каля месца здымак, ён убачыў маладую кінаактрысу. Плечы дзяўчыны ўздрыгвалі — яна плакала.

— Што з табою, цябе пакрыўдзіў конь?

А. СЕРАБРАКОЎ.

## ЮЛЬКА, ЮЛЬКА...

НАВЕЛА

— Не, калі б пакрыўдзіў?! Але ён заўсёды скідвае мяне, ніяк не навучуся ездзіць вярхом.

— Значыць, ты няправільна садзішся. Вось глядзі, як трэба.

Ён маланкай ускочыў у сядло і панёсся праз усё поле.

— У мяне ідэя! У гэтым эпізодзе ты мяне заменіш!

У Пятра ад здзіўлення і нечаканасці бровы палезлі ўверх і сам па сабе адкрыўся рот. Гэта ён — вясковы хлопец — і раптам у кіно. Але дзяўчынка ад радасці адкрыцця ледзь не заскакала, раптам сарвалася з месца і паімчалася, а ён не паспеў сказаць ні слова, ды так і застаўся стаяць ля каня з адкрытым ротам. Праз дзень здымкі працягваліся. Дублёрам наезніцы быў Пятро. Так ён пазнаёміўся з Юлькай Захаравай. Потым увесь месяц яны былі разам: на рэчцы, у школьным парку, у кіно і нават на кіназдымках. Юлька расказвала цікавыя выпадкі з жыцця кінаакцёраў, а Пятрусь аб сваіх прыгодах, аб самым дарагім і любым у іх вёсцы, паказваў ёй самыя патаемныя мясціны, самае запаветнае і святое.

Як ён чакаў заўсёды сустрэчы з Юлькай! Пятро саромеўся і баяўся свайго пачуцця, баяўся выдаць яго неасцярожным рухам вачэй, неабдуманым словам. Здавалася, здарыцца гэта — і ўсё ў імгненне прападзе: цуд сустрэчы, незвычайнасць сяброўства, асалода ад адной толькі думкі, што яна, Юлька, ёсць, што яе можна бачыць, гутарыць з ёю, узяўшыся за рукі, імчацца да казачнага берага Дняпра.

А як Юлька? І ў яе ж павінна адбывацца такое, яна ж была такой ласкавай, такой уважлівай, такой казачна неверагоднаю.

Юлька паехала, як толькі скончыліся кінаработы...

Спачатку пісьмы атрымліваў кожнага дня. Пасля — радзей. І раптам прыйшло яно, тое, апошняе. «У новым фільме здымаюся, у галоўнай ролі. Расказала сяброўкам пра наш «раман», смяюцца. Будзе лепш, калі мы перастанем сябраваць. Гэта мяне адрывае ад мастацтва, ды і ўвогуле...»

...Пятрусь не заўважыў, як выйшаў да шашы, як падышоў аўтобус, як той крануўся. Гэта быў першы рэйс Пятра ў юнацтва і сталасць.

І ў дарозе з ім быў цяжар думак, расчаравання, роспачы, адчуванне душэўнай страты. Нешта разбілася, нешта разлілося і яшчэ выцякае — дарагое, жывое.

А што будзе ў гэтым рэйсе?

Шлях пакажа.

### В. АСАЦ

Вот опять при кленовом закате
Ах, как видится-мнится острей
Мне девчонка в коротеньком
платье
Цвета неба моих сентябрей;
И опять проходящие люди
Громко пальцами рядом
хрустят
И ее на заре то осудят,
То опять на закате простят...
А в краю, где туманом
в низины
Мое эхо ушло поутру,
Старый ясень в объятьях
рябины
Засыхает, гудя на ветру;
И она, в голубом и веселом,
Их стволы согревает щекой,
А в ее окружающих селах—
Тишина и холодный покой;
А в ее силуэте—заклятье
Стебелька у дорог, а на ней—
Ах, как мнится!—короткое
платье
Цвета неба моих сентябрей.

ДЭБЮТ

### Т. БАРОДЗІЧ

Пачатак жыцця.
Дзень яго першы.
Быць яму творчым,
Ці можа бяздзейсным?
Свята звычайна
Песняй страчаюць!
Песня мая—
Далонь з мазалямі—
Вяснянай пралескай!
У букеце рук працоўных—
Яшчэ адна кветка...

* * *

**Што нас наперадзе чакае—**
**Таго, вядома, не мінуць.**
**Світанні мы не сустракаем,**
**А захад сонца—як зірнуць.**
**Усё у нас, каб быць**
**не разам—**
**Халодны дзейнічае розум,**
**Ды сэрцы цяжка расхінуць.**

### У. УСЕНЯ

Непаўторнасць імгнення
кожнага,
Ясных дзён трапяткая
ўзнёсласць!..
З журавлінай песняй
трывожнаю
Адлятаюць у вырай вёсны...

А дзяцінства сонечнай
чырванню
Дагарае на сцежках росных.
Жураўлі вяртаюцца з выраю.
І ці вернуцца вёсны?
Вёсны...

## ПЛЁН НАТХНЕННЯ








Наталля Дораш (Якіменка) малюе з дзяцінства. Калі жыла ў Гродна — яе малюнкі не раз выстаўляліся ў мясцовым Доме піянераў; калі па сямейных абставінах давялося жыць некаторы час у Польшчы — іх друкавалі мясцовыя газеты. Потым у Наташы паявілася новае захапленне — фатаграфаванне. І вольны час падзяліўся надвае.

У гэтым годзе Дораш паступіла ва універсітэт на І курс факультэта журналістыкі. Проба пяра адбылася ў газеце «Гродненская правда», калі разам з малюнкамі Наташа пачала прыносіць туды свае артыкулы.

Прадстаўляючы сёння новага, і трэба сказаць, таленавітага члена шматлікага універсітэцкага калектыву, мы выказваем спадзяванні, што Наташа не раз здзівіць сваіх таварышаў па вучобе цікавымі малюнкамі і фотаздымкамі.

Наш вернісаж на тэму «Той далёкі век...»

В. а. рэдактара В. А. ВОЛЬСКІ.

«Белорусский университет» — орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Газета выходзіць па чацвяргах. Тыраж 2.000 экз.
Аб'ём — 1,5 друк. ар. АТ 03538 Заказ № 1608.